# УСТУПНАЕ СЛОВА

Шаблоўскія чытанні студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў – даніна пашаны доктару філалагічных навук, прафесару Ірыне Вікенцьеўне Шаблоўскай, загадчыцы кафедры замежнай літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, якая пастаянна рупілася пра прыцягненне студэнтаў самых розных спецыяльнасцяў да прафесійнага даследавання сусветнай і беларускай літаратур, да мастацкага перакладу, да ўласнай мастацкай творчасці. Прафесарка дбала пра стварэнне навуковага асяродку, у якім студэнты і аспіранты маглі б апрабіраваць свае першыя навуковыя адкрыцці, падзяліцца напрацоўкамі, прапанаваць нечаканыя ракурсы вывучэння класічнай і сучаснай літаратур, паглыбіць тэарэтычную базу сваіх даследаванняў. Адметна, што ўсе шасцёра кандыдатаў філалагічных навук, якія абараніліся пад кіраўніцтвам прафесара І. В. Шаблоўскай (В. В. Халіпаў, А. У. Вострыкава, М. М. Хмяльніцкі, Г. М. Бутырчык, Н. С. Паваляева, Н. В. Нестар), засталіся ў прафесіі, і, працягваючы традыцыі настаўніка, выхавалі ўласных вучняў, у якіх, у сваю чаргу, з’явіліся свае вучні. Артыкулы, якія вы знойдзеце ў гэтым зборніку, – гэта навуковы даробак трэцяга пакалення вучняў Ірыны Вікенцьеўны Шаблоўскай і вучняў яе калег Таццяны Уладзіміраўны Кавалёвай, Евы Аляксандраўны Лявонавай, Галіны Веніямінаўны Сініла.

Мэта чытанняў – захаванне пераемнасці ў даследаванні сусветнай літаратуры, далучэнне маладога пакалення да навуковай школы І. В. Шаблоўскай, развіццё такіх літаратуразнаўчых кірункаў, як кампаратывістыка, беларуская літаратура ў сусветным кантэксце, нацыянальнае і ўніверсальнае, праблема іншасці і формы яе рэалізацыі ў літаратуры. Будзем спадзявацца, што новае выданне кафедры замежнай літаратуры разам са зборнікам матэрыялаў штогадовых навуковых канферэнцый студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў “Juventus in litteratura” дасць магчымасць таленавітым студэнтам, магістрантам, аспірантам разгорнута падаць вынікі сваіх даследаванняў і атрымаць навыкі напісання навуковых артыкулаў.

*Загадчык кафедры замежнай літаратуры БДУ,*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт*
*Бутырчык Ганна Міхайлаўна*